Падтрымай "Вясну" на PATREON

# Бяроза: падчас фармавання раённай ТВК адзінагалосна прагаласавалі за гатовы спіс кандыдатаў дакумент

25.11.2017 **Тэгі**: выбары-2018



**24 лістапада 2017 г. на сумесным пасяджэнні прэзідыума Бярозаўскага раённага Савета дэпутатаў і Бярозаўскага раённага выканаўчага камітэта была ўтвораная Бярозаўская раённая выбарчая камісія па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў дваццаць восьмага склікання.**

Паводле словаў назіральніка **Сяржука Русецкага**, паседжанне, якое вёў старшыня райвыканкаму Леанід Мартынюк, цягнулася каля 30 хвілінаў.

Усяго на сяброўства ў абласной камісіі прэтэндавалі 17 чалавек: 8 было вылучана ад праўладных грамадскіх аб'яднанняў ("Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане", саюза афіцэраў, Беларускага саюза жанчын, Прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму, фонду міра, ГА «Белая Русь»), па аднаму чалавеку ад Камуністычнай партыі Беларусі і ад працоўнага калектыву ААТ «Бярозаўскі сыраробчы камбінат» і 7 шляхам збору подпісаў.

Быў зацверджаны максімальны колькасны склад камісіі — 13 чалавек.

Паводле Сяржука Русецкага, начальнік аддзелу кадравай працы райвыканкаму **Віталь Мшар** зачытаў даволі падрабязную інфармацыю па кожнай кандыдатуры. І такім чынам можна было даведацца пра год нараджэння, адукацыю, горад пражывання, месца працы, пасаду, ранейшы ўдзел у працы выбарчых камісіяў, сяброўства ў розных грамадзкіх арганізацыях, некаторыя асабістыя дзелавыя якасці; прыцягненне да крымінальнай ці адміністратыўнай адказнасці.

Затым некаторыя прадстаўнікі райвыканкаму і райсавету заклікалі астатніх прысутных падтрымаць канкрэтных прэтэндэнтаў, характэрызуючы іх лепшыя дзелавыя якасці.

Калі дайшла чарга да абмеркавання дзелавых якасцяў назіральніцы ад Беларускага Хельсінкскага Камітэту **Тамара Шчапёткіна**, якую група выбаршчыкаў шляхам падачы заявы таксама вылучыла ў раённую камісію, прысутныя чыноўнікі агучылі, што яна некалькі разоў прыцягвалася да адміністратыўнай адказнасці за парушэнне парадку арганізацыі і правядзенне масавых мерапрыемстваў, а таксама за працу журналісткай без акрэдытацыі.

Пасля абмеркавання кандыдатур быў зачытаны спіс тых, хто, па меркаванні ўдзельнікаў паседжання, мусіць быць уключаны ў склад Бярозаўскай раённай выбарчай камісіі. Усе прысутныя адзінагалосна прагаласавалі за гэты спіс. Такім чынам была парушана Пастанова ЦВК №36, дзе адзначаецца, што *“калі лік прэтэндэнтаў у склад выбарчай камісіі перавышае прадугледжаную колькасць членаў камісіі, заслухоўваецца інфармацыя па кожнай кандыдатуры і праводзіцца персанальнае галасаванне”*.

Па якіх крытэрыях і кім быў зроблены адбор у прапанаваны персанальны склад выбарчай камісіі засталося невядомым.

У выніку склад Бярозаўскай раённай выбарчай камісіі вельмі мала змяніўся ў параўнанні з мінулымі гадамі, адзначае Сяржук Русецкі. У камісію ўключылі трох супрацоўнікаў Бярозаўскага райвыканкаму: намесніка начальніка аддзелу ідэалягічнай працы, культуры справах моладзі **Крагеля Аляксандра Уладзіміравіча**, галоўнага спецыяліста аддзелу кадравай працы **Муратаву Алену Георгіеўну**, начальніка аддзелу кадравай працы Мшара Віталя Уладзіміравіча.

З агучанай інфармацы вынікае, што ў створанай камісіі — 2 сябры КПБ і 3 прадстаўнікі “Белай Русі”.

Не былі ўключаныя ў камісію “два прадстаўнікі саюза афіцэраў і раённай арганізацыі прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму (асноўныя — першыя прадстаўнікі гэтых арганізацыяў у камісію патрапілі), а таксама двое прэтэндэнтаў, вылучаных шляхам збору подпісаў, у тым ліку і адзіная прадстаўніца дэмакратычнага блоку Тамара Шчапёткіна, якая мае вялікі досвед працы ў выбарчых кампаніях.

У канцы працоўнага дня 24 лістапада адбылося першае пасяджэнне Бярозаўскай раённай выбарчай камісіі. Старшынёй камісіі быў абраны **Чарнагор Аляксандр Рыгоравіч**, намеснікам старшыні камісіі — Крагель Аляксандр Уладзіміравіч, сакратаром — Муратава Алена Георгіеўна.

Выбаршчыкі, якія сваімі подпісамі шляхам падачы заявы вылучылі Тамару Шчапёткіну ў раённую выбарчую камісію, маюць намер абскардзіць яе неўключэнне ў судзе.

*"Праваабаронцы за свабодныя выбары"*

## Файлы

- Sklad Biarozaŭskaj rajonnaj TVK i paraŭnannie z 2015, 2016 (tablica) (0.01 Mb)

Твитнуть








# ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Мой статус быў "злосны парушальнік". Леанід Судаленка — пра зняволенне, ад'езд з Беларусі і салідарнасць

Беларусы на "крытай": як палітвязняў працягваюць пераследаваць у калоніях (дапоўнена)

Памёр палітзняволены мастак Алесь Пушкін (дапоўнена)



ГАЛОЎНАЕ

Як пераследуюць беларусаў за камунікацыю з "экстрэмісцкімі" медыя



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

# Спіс палітычных вязняў

## АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява беларускіх праваабарончых арганізацый у сувязі з прызнаннем "Вясны" экстрэмісцкім фармаваннем

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні 17 чалавек палітычнымі зняволенымі

Жыхара Смалявіцкага раёна за ўдзел у нядзельным маршы пратэсту асудзілі да "хатняй хіміі"

"Маючы пры сабе атрыбутыку – сцяг бел-чырвона-белага колеру, выказваў свае грамадска-палітычныя погляды"

Супрацоўніцу БНТУ асудзілі па "народным" артыкуле за ўдзел у акцыях пратэсту

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Стаў вядомы прысуд вядомаму сталічнаму самелье Аляксандру Кульбачку

За абразу Лукашэнкі ў Мінску асудзілі кіроўцу

Барысаўскага пенсіянера асудзілі за абразу Лукашэнкі і супрацоўніка міліцыі (дапоўнена)

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

# Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Ліпень 2023



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

## Рэферэндум 2022







## ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC Memorial
Anti-Discrimination Centre

## СЯБРОЎСТВА

ENEMO
European Network of Election Monitoring Organizations

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh
















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY